www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

БДУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

20 сакавіка 2007 года, № 5 (1956)

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## БДУ Ў ЭМІРАТАХ



***У рамках афіцыйнага візіту ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты дзяржаўнай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь з 4 па 6 сакавіка на чале з Прэзідэнтам нашай краіны Аляксандрам Лукашэнка, рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў падпісаў пагадненне аб супрацоўніцтве БДУ з універсітэтам горада Аль-Аін (Al-Ain).***

Гэтае пагадненне прадугледжвае супрацоўніцтва ў вучэбнай і навуковай сферах, абмен выкладчыкамі і студэнтамі, удзел у сумесных навуковых распрацоўках. Па словах рэктара, у хуткім часе гэты дакумент будзе дапоўнены канкрэтнымі праектамі, пераважна ў галіне матэматыкі і прыродазнаўчых навук.

Акрамя таго, Васіль Стражаў асабіста пазнаёміўся з універсітэтам, які ўзначальвае член правячай дынастыі міністр адукацыі і выхавання Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў Ханіф Хасан Аль Касім. У структуры ВНУ 10 вучэбных падраздзяленняў з 14-цю тысячамі студэнтаў дзённай формы. Дарэчы, значную колькасць складаюць дзяўчаты, што незвычайна для арабскага рэгіёна. На інжынернай спецыяльнасці іх амаль 54 %. Праўда, юнакі і дзяўчаты атрымліваюць адукацыю паасобку. Навучанне і пражыванне моладзі ў інтэрнатах ажыццяўляецца за кошт дзяржавы. Выкладанне вядзецца цалкам на англійскай мове. Кіраўніцкія і выкладчыцкія пасады ў асноўным займаюць іншаземцы.

Васіль Стражаў назваў падпісанне пагаднення першым крокам у наладжванні стасункаў БДУ з галоўнай вышэйшай навучальнай установай ААЭ, прычым адзначыў, што новыя партнёры выявілі вялікую зацікаўленасць у развіцці кантактаў з вядучым беларускім універсітэтам.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
**Фота Пятра ШУЛЬГІ**

КАНФЕРЭНЦЫІ

## ФОРУМ РУСКАЙ МОВЫ

**Беларускі форум русістаў адбыўся ў Мінску 15–16 сакавіка. Яго ініцыятарам выступіла пасольства Расійскай Федэрацыі ў Беларусі, якое і стала арганізатарам гэтага мерапрыемства разам з Міністэрствам адукацыі нашай краіны і філалагічным факультэтам Белдзяржуніверсітэта.**

Форум прайшоў у рамках Года рускай мовы, абвешчанага ў 2007 г. у Расіі і за яе межамі.

Яго ўрачыстае адкрыццё адбылося 15 сакавіка ў канферэнц-зале гасцініцы "Мінск". З вітальным словам перад прысутнымі выступілі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол РФ у нашай краіне Аляксандр Сурыкаў, міністр адукацыі Беларусі Аляксандр Радзькоў, рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец. На гэтым мерапрыемстве прысутнічалі таксама прадстаўнікі Міністэрства адукацыі Расіі, урада Масквы і Мінскага гарвыканкама.

На наступны дзень на філалагічным факультэце пачалася работа секцый, у якой прынялі ўдзел каля 200 выкладчыкаў рускай мовы з вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, вучоных-русістаў, пісьменнікаў, дзеячаў мастацтва і журналістаў. Разглядаліся пытанні, што тычацца выкладання рускай мовы, яе функцыянавання ў сродках масавай інфармацыі, выкарыстання ў літаратуры, кіно, тэатрах, на эстрадзе, а таксама як сродку выхавання моладзі.

**Яўген ПЕШЧУР**

ВІЗІТЫ

## ЕЎРАПЕЙСКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА БДУ

***Генеральны дырэктар Выканаўчага сакратарыята Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывы (ВС ЦЕІ) Харальд Крайд у рамках афіцыйнага візіту ў Рэспубліку Беларусь наведаў 1 сакавіка Беларускі дзяржаўны універсітэт.***



*Генеральны дырэктар Выканаўчага сакратарыята Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывы (ВС ЦЕІ) Харальд Крайд (справа) на сустрэчы з кіраўніцтвам БДУ*

Мэта візіту – актывізацыя практычнага ўзаемадзеяння БДУ з Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывай па лініі Універсітэцкай сеткі ЦЕІ. Яе асноўнай задачай з'яўляецца развіццё кааперацыі паміж установамі вышэйшай адукацыі краін ЦЕІ праз арганізацыю сумесных адукацыйных праектаў – канферэнцый, семінараў, летніх школ і магістэрскіх праграм.

Харальд Крайд сустрэўся з выкладчыкамі і студэнтамі Белдзяржуніверсітэта на факультэце міжнародных адносін, дзе распавёў пра дзейнасць Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывы як рэгіянальнага аб'яднання, пра мэты і задачы гэтай арганізацыі. Гаворка ішла пра перспектывы супрацоўніцтва ў вобласці сумесных з БДУ адукацыйных праектаў і праграм у рамках Універсітэцкай сеткі ЦЕІ. Нагадаем, што Белдзяржуніверсітэт з'яўляецца універсітэтам-каардынатарам гэтай сістэмы сярод краін–удзельніц ЦЕІ.

У рамках праграмы знаходжання ў БДУ адбылася таксама сустрэча Харальда Крайда з рэктарам Белдзяржуніверсітэта прафесарам Васілём Стражавым.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення міжнародных сувязяў**
**Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА**

### Даведка

Цэнтральна-Еўрапейская Ініцыятыва (ЦЕІ) – рэгіянальнае аб'яднанне, створанае ў 1989 г. У яго склад уваходзяць 17 дзяржаў Цэнтральнай Еўропы. Беларусь далучылася да ЦЕІ ў 1996 г. Галоўная задача ЦЕІ – аб'яднаць намаганні краін-членаў па ўмацаванні гнуткага і прагматычнага еўрапейскага рэгіянальнага супрацоўніцтва, зблізіць гэтыя дзяржавы і дапамагчы ім у еўрапейскай інтэграцыі. Практычныя пытанні супрацоўніцтва разглядаюцца ў рамках спецыялізаваных рабочых груп ЦЕІ. Так, напрыклад, пытанні адукацыі абмяркоўваюцца экспертамі Рабочай групы па адукацыі, якая была створана ў 2003 г., тады ж і было вырашана стварыць Універсітэцкую сетку ЦЕІ.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**НА ШЛЯХУ ДА ДЗЯРЖАЎНАСЦІ БЕЛАРУСІ**
Стар. 2

**РАЗМЕРКАВАННЕ Ў ПЫТАННЯХ І АДКАЗАХ**
Гутарка з прадстаўнікамі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі
Стар. 3

**У БДУ З'ЯВІЎСЯ «СУПЕРМЭН»!**
Сярод студэнтаў знойдзены ідэальны мужчына
Стар. 4

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ДОКТАР медыцынскіх навук прафесар Аляксандр Касінец, які з'яўляецца віцэ-прэм'ерам беларускага ўрада, 2 сакавіка паспяхова абараніў у БДУ магістэрскую дысертацыю па эканоміцы. Рэктар Белдзяржуніверсітэта Васіль Стражаў асабіста павіншаваў новага магістра эканомікі і ўручыў яму адпаведны дыплом.

ТРАДЫЦЫЙНАЯ сустрэча рэктара БДУ Васіля Стражава са студэнтамі адбылася 15 сакавіка ў інтэрнаце № 2. Былі абмеркаваны праблемы, якія хвалююць студэнтаў. Падобныя сустрэчы запланаваны на наступным тыдні таксама ў інтэрнатах № 6 і 7.

У РАМКАХ адзінага Дня інфармавання насельніцтва рэктар БДУ Васіль Стражаў 17 сакавіка сустрэўся з калектывам сталічнай гімназіі № 1.

ДЭЛЕГАЦЫЯ БДУ на чале з прарэктарам па вучэбнай рабоце Віктарам Самахвалам наведала ў рамках праекта «Тэмпус» універсітэт Малага (Іспанія).

БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ наведала 13 сакавіка дэлегацыя Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці на чале з намеснікам дырэктара спадарыняй Ханг Гау. Высокія госці правялі перамовы з прарэктарам па навуковай рабоце Уладзімірам Паньковым аб супрацоўніцтве.

ДНІ АДКРЫТЫХ ДЗВЯРЭЙ для абітурыентаў пройдуць 23–31 сакавіка на ўсіх вучэбных падраздзяленнях Белдзяржуніверсітэта.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

# НА ШЛЯХУ ДА ДЗЯРЖАЎНАСЦІ БЕЛАРУСІ

***Нацыянальна-дзяржаўнае самавызначэнне беларускага народа – доўгі, складаны і супярэчлівы працэс. Знаходзячыся на скрыжаванні шляхоў зносін і культур, беларускі народ насуперак лёсу не знік, не страціў сваю нацыянальную і культурную адметнасць і здолеў пабудаваць незалежную дзяржаву.***

Падзенне самаўладдзя, а затым кастрычніцкія падзеі 1917 г. садзейнічалі працэсу нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на Беларусі. Прадстаўнікі нацыянальна-дэмакратычнага кірунку беларускага нацыянальнага руху, якія групаваліся вакол Вялікай беларускай рады, выступалі за тэрміновае самавызначэнне Беларусі ў складзе федэрацыі з Расійскай дэмакратычнай рэспублікай, аб чым сведчаць рашэнні I Усебеларускага з'езда ў снежні 1917 г. У сваю чаргу лідэры сацыялістычнага левaрадыкальнага напрамку, прадстаўленага Беларускім абласным камітэтам, Беларускім нацыянальным камісарыятам, выказваліся першапачаткова за абласную аўтаномію.

Аднак сітуацыя ўскладнялася тым, што рэальная ўлада, якая ўсталявалася ў Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, не падтрымлівала ніякіх прапаноў нацыянальнага самавызначэння ці абласной аўтаноміі. Створаны 27 лістапада 1917 г. Абласны выканаўчы камітэт саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту, а таксама Паўночна-Заходні абласны камітэт РКП(б) разглядалі беларускую дзяржаву як перашкоду ў развіцці сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Галоўным для іх быў лозунг інтэрнацыянальнага адзінства працоўных усяго свету ў барацьбе з буржуазіяй. І гэтая пазіцыя не была выпадковай. Так, адміністрацыйная камісія УЦВК РСФСР, нягледзячы на абвешчаную 2 лістапада 1917 г. "Дэкларацыю правоў народаў Расіі", прапанавала на тэрыторыі былой Расійскай імперыі ліквідаваць усялякі нацыянальны падзел і стварыць, акрамя Маскоўскай, яшчэ 3 вобласці (камуны): Заходнюю, Паўночную і Уральскую.

Пасля акупацыі ў лютым 1918 г. войскамі кайзераўскай Германіі большай часткі Беларусі дзеячы нацыянальна-дэмакратычнага напрамку (І. Варонка, Т. Грыб, К. Езавітаў, А. Карач, П. Крачэўскі, І. Серада і інш.) абвясцілі ў сакавіку 1918 г. Беларускую Народную Рэспубліку. Хоць яна абвяшчалася ў этнічных межах пражывання беларусаў, але сваю юрысдыкцыю на гэтай тэрыторыі не ажыццяўляла. Нягледзячы на тое, што ў выглядзе Рады ВНР і Народнага сакратарыята была створана пэўная палітычная структура, якая выступала ў якасці заканадаўчай і выканаўчай улады, БНР не была прызнана ні германскімі ўладамі, ні ўрадамі вядучых краін свету – ЗША, Англіяй, Францыяй і інш. Акт самавызначэння БНР не падтрымала ў асноўнай сваёй масе і насельніцтва Беларусі, паколькі было адноўлена памешчыцкае землеўладанне, а старшыня Народнага сакратарыята І. Варонка ў дэкрэце ад 12 чэрвеня 1918 г. аб'явіў нядзейснымі на тэрыторыі БНР дэкрэты ўрада Леніна. Далей стварэння прадстаўніцтва БНР пры германскай акупацыйнай адміністрацыі на павятовым узроўні і рашэнняў некаторых пытанняў у культурна-асветнай сферы нямецкія акупацыйныя ўлады не пайшлі. Такім чынам, БНР як самастойнае дзяржаўнае ўтварэнне не сфарміравалася, але спроба яе абвяшчэння пэўным чынам паўплывала на працэс далейшага самавызначэння беларускага народа.

Станаўленне фактычнай беларускай дзяржаўнасці звязана з утварэннем Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь, што праходзіла не менш складана, чым узнікненне БНР. Пасля адыходу нямецкіх акупацыйных войскаў, звяржэння манархіі ў Германіі і скасавання ў лістападзе 1918 г. Брэсцкага мірнага дагавору паўстала пытанне аб дзяржаўным уладкаванні вызваленых ад нямецкай акупацыі нацыянальных раёнаў. У сувязі з тым, што пазіцыя партыйна-савецкага кіраўніцтва Заходняй вобласці не змянілася, на канферэнцыі Беларускіх секцый РКП(б), што прайшла ў Маскве 21–23 снежня 1918 г. сярод бежанцаў-беларусаў у Петраградзе, Маскве, Саратаве, Тамбове і іншых гарадах, было прынята рашэнне аб стварэнні Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі. А 24 снежня 1918 г. пытанне дзяржаўнасці Беларусі было станоўча вырашана ў ЦК РКП(б).

25 снежня старшыня Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцяў І. Сталін сустрэўся з З. Жылуновічам, І. Дылам і іншымі адказнымі супрацоўнікамі Белнацкама і Беларускіх секцый РКП(б), а 27 снежня – з А. Мясніковым і М. Калмановічам, кіраўнікамі Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) і Аблвыкамзаха. Былі вызначаны паўнамоцтвы і склад будучага ўрада, акрэслена тэрыторыя рэспублікі ў складзе 5-ці губерняў (Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай).

Таму VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б), што адбылася 30–31 снежня ў Смаленску і канстытутавалася як I з'езд КП(б)Б, прыняла рашэнне "абвясціць Заходнюю камуну самастойнай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай". У пастанове аб тэрыторыі рэспублікі асноўным яе ядром лічылася Мінская, Смаленская, Магілёўская, Віцебская і Гродзенская губерні з прылеглымі да іх мясцовасцямі суседніх губерняў, населенных пераважна беларусамі.

Увечары 1 студзеня пасля абвостраных спрэчак паміж З. Жылуновічам і А. Мясніковым, якія асабіста ўладжваў І. Сталін, быў сфарміраваны Часовы рабоча-сялянскі савецкі ўрад Беларусі. У склад яго ўвайшлі 7 прадстаўнікоў Белнацкама і Беларускіх секцый РКП(б) і 9 прадстаўнікоў Паўночна-Заходняга абкама і Аблвыкамзаха, ранейшых праціўнікаў стварэння беларускай дзяржаўнасці. У гэты дзень на радыё прагучаў Маніфест Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі. У ім заканадаўча замацоўваліся асноўныя палажэнні палітычнага і грамадскага ладу. 3 студзеня Аблвыкамзах заявіў аб самароспуску. 5 студзеня Урад ССРБ пераехаў са Смаленска ў Мінск.

Аднак і пасля гэтых падзей пытанне беларускай дзяржаўнасці не было знята з парадку дня. Так, 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) прыняў адмоўнае для беларускай дзяржаўнасці рашэнне: забраць у толькі што створанай Беларускай рэспублікі Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні і ўключыць іх у склад РСФСР, пакідаючы Беларусі толькі Мінскую і Гродзенскую. Сакратар ЦК РКП(б) і старшыня УЦВК РСФСР Я. Свярдлоў уласнаручна дапісаў пункт 7 пастановы, які прадпісваў вынесці на з'езд Саветаў Беларусі рашэнне аб аб'яднанні гэтых губерняў з Літвой.

У беларускай гістарыяграфіі існуе спрошчаны погляд, што такое рашэнне было прадыктавана прычынамі знешнепалітычнага характару, наступленнем войскаў Польшчы. Аднак гэта наступленне пачалося пазней, 14 лютага 1919 г. Таму рашэнне ЦК РКП(б) было абумоўлена ў першую чаргу прычынамі ўнутрыпартыйнага і эканамічнага характару. Ва ўмовах грамадзянскай вайны, пераходу да палітыкі харчразвёрсткі асноўнай праблемай для Савецкай улады была харчовая. Выпадзенне з гаспадарчай сістэмы трох губерняў – Смаленскай, Магілёўскай і Віцебскай – стварала дадатковыя цяжкасці для функцыянавання традыцыйна склаўшыхся гаспадарчых сувязяў заходніх губерняў з Цэнтрам.

Для ажыццяўлення рашэння ЦК у Беларусь камандзіраваўся ўпаўнаважаны ЦК РКП(б) Ад. Іофе.

Супраць штучнага падзелу этнічнай Беларусі пратэставалі не толькі група З. Жылуновіча, але і А. Мяснікоў са сваімі прыхільнікамі. Пра гэта сведчыць пратакол пасяджэння Цэнтральнага бюро КП(б)Б ад 22 студзеня, на якім прысутнічаў Ад. Іофе. Усе 8 членаў Бюро адхілілі яго прапанову падзяліць тэрыторыю рэспублікі і вырашылі звярнуцца ў ЦК РКП(б) з просьбай перагледзець пытанне аб усходніх губернях Беларусі. Таму Ад. Іофе ў лісце да Я. Свярдлова ад 28 студзеня адзначаў, што абедзве групы нікуды не вартыя. Беларусы, ці група Жылуновіча, – нацыяналісты, а Мяснікоў і яго прыхільнікі – хаця і не нацыяналісты, але сепаратысты яшчэ горшай маркі. І раіў разагнаць іх, паслаць на працу куды-небудзь далей ад Беларусі.

Невыпадкова, што ў I Усебеларускім з'ездзе Саветаў 2–3 лютага 1919 г. прыняў асабісты ўдзел Я. Свярдлоў. З'езд Саветаў адобрыў прынятае ЦК РКП(б) рашэнне аб утварэнні Літоўска-Беларускай Савецкай Рэспублікі. 27 лютага 1919 г. у Вільні на аб'яднаным пасяджэнні ЦВК Літоўскай і Беларускай ССР было абвешчана аб аб'яднанні дзвюх рэспублік у адну.

У склад новага ўрада ЛітБела З. Жылуновіч не ўвайшоў, бо ў пачатку лютага быў накіраваны на журналісцкую працу ў Харкаў. А. Мяснікоў у маі 1919 г. быў камандзіраваны на Усходні фронт у рангу камандуючага Паволжскім фронтам.

Пасля вызвалення Мінска 11 ліпеня 1920 г., а затым большай часткі тэрыторыі Беларусі ад польскіх войскаў склаліся аб'ектыўныя перадумовы для аднаўлення беларускай дзяржаўнасці. Для падрыхтоўкі другой, адпаведнай дэкларацыі была створана камісія. У яе склад увайшлі два прадстаўнікі ад КП(б)ЛіБ, чатыры – ад Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р), з якой усталявалася супрацоўніцтва на глебе сумеснай барацьбы з польскай акупацыяй, па аднаму прадстаўніку ад Беларускай камуністычнай арганізацыі і Бунда. Ужо на першым сходзе камісіі выявілася, што галоўным разыходжаннем БПС-Р з пазіцыяй камуністаў было пытанне межаў Беларусі. Прадстаўнікі БПС-Р настойвалі, каб у акце абвяшчэння незалежнасці Беларусі быў дакладна акрэслены прынцып этнічнага самавызначэння. Аднак прадстаўнік камуністаў В. Кнорын адказаў, што яны "не могуць дапусціць, каб Смаленская, Магілёўская і Віцебская губерні адышлі да Беларусі, таму што там жывуць рускія людзі і там няма беларусаў". Прадстаўнікі БПС-Р афіцыйна заявілі, што пад такой Дэкларацыяй аб стварэнні ССРБ сваіх подпісаў не паставяць, а таксама адмовіліся ўвайсці ў склад Часовага рэвалюцыйнага камітэта.

ЦК КП(б)ЛіБ выказаўся за разрыў адносінаў з беларускімі эсэрамі. Аднак падчас перамоў паміж Расійскай і Польскай дэлегацыямі аб умовах прэлімінарнага дагавору патрэбна было аб'яднаць палітычныя сілы, якія адстойвалі тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі, а не яе раз'яднанне.

Беларуская нацыя і яе этнічная тэрыторыя пасля заключэння 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага дагавора аказалася раздзеленай на тры часткі. Як суверэнная дзяржава ССРБ існавала пасля другога абвяшчэння ў межах толькі 6-ці паветаў былой Мінскай губерні (Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мазырскі, часткова Мінскі і Слуцкі). Яе плошча складала 52,4 тыс. км², а насельніцтва – 1млн 544 тыс. чалавек.

Жыццё вельмі хутка паказала, што штучны разрыў адзінага этнасацыяльнага арганізма беларускай нацыі з'яўляецца вялікай перашкодай паспяховаму нацыянальна-дзяржаўнаму і культурнаму будаўніцтву Беларусі. Гэта канстатавалася ў дакладной запісцы, што паступіла ў ЦК КП(б)Б 1 лютага 1921 г. за подпісамі 32-х камуністаў-беларусаў, сярод якіх былі ўплывовыя тагачасныя маладыя савецкія работнікі: П. Ільючонак, С. Булат, Я. Каранеўскі – будучы рэктар БДУ, М. Кудзелька і інш. Заява паклала пачатак практычнаму вырашэнню праблемы ўсходніх этнічных беларускіх зямель.

Уваходжанне БССР* у склад СССР, удасканаленне саюзных адносін паміж рэспублікамі паскорыла вырашэнне тэрытарыяльнага пытання. Толькі ў сакавіку 1924 г., дзякуючы актыўным палітычным намаганням тагачаснага старшыні ЦВК Беларусі А. Чарвякова, старшыні Саўнаркама Яз. Адамовіча, наркама асветы У. Ігнатоўскага і іншых дзяржаўных дзеячаў (была выкарыстана тактыка паслядоўных зваротаў да кіраўніцтва СССР, пошук уплывовых прыхільнікаў у Маскве, а таксама нявырашанасць праблемы нацыянальных меншасцяў у Польшчы), да БССР былі далучаны 8 паветаў Віцебскай, 7 паветаў Гомельскай, Горацкі і частка Мсціслаўскага павета Смаленскай губерняў. Аднак Гомельскі і Рэчыцкі паветы адышлі да Беларусі толькі праз два гады ў снежні 1926 г.

Не пазбегла рэспубліка і тэрытарыяльных страт (Веліжскі, Невельскі і Себежскі паветы Віцебскай губерні былі ўключаны ў склад Пскоўскай губерні). Тым не менш, тэрыторыя Беларусі склала 125,6 тыс. км² з насельніцтвам каля 6 млн чалавек.

Вяртанне ўсходніх тэрыторый да БССР з'явілася важным этапам у складаным працэсе аб'яднання беларускай нацыі, узмацніла эканамічны патэнцыял Савецкай Беларусі і павялічыла міжнародны аўтарытэт рэспублікі.

Заключным крокам стала ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР у верасні–кастрычніку 1939 г. Плошча БССР павялічылася да 225 тыс. км², насельніцтва – да 10,3 млн чалавек. Доўгі і складаны шлях тэрытарыяльнай і этнапалітычнай кансалідацыі беларускай нацыі практычна завяршыўся. Беларусь за гады савецкай улады стала індустрыяльна развітай рэспублікай і праславілася на ўвесь свет гераічным супраціўленнем у гады Вялікай Айчыннай вайны.

На аснове БССР у 1991 г. была абвешчана і паспяхова будуецца суверэнная Рэспубліка Беларусь. 15 сакавіка 1994 г. была прынята Канстытуцыя першай незалежнай беларускай дзяржавы. 24 лістапада 1996 г. на народным галасаванні (рэферэндуме) у яе тэкст былі ўнесены некаторыя змяненні і дапаўненні, прапанаваныя Прэзідэнтам краіны.

**Уладзімір ЛАДЫСЕЎ,**
**доктар гістарычных навук,**
**прафесар**

**Фота БелТА і з архіва**

* Афіцыйная назва ССРБ пасля 30 снежня 1922 г.



Старшыня Урада БССР Кузьма Кісялёў падпісвае Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Сан-Францыска, 26 чэрвеня 1945 г.




Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падчас выступлення на святкаванні Дня Незалежнасці. Мінск, 3 ліпеня 2006 г.



Камандаванне Першага беларускага камуністычнага атрада і супрацоўнікі Петраградскага аддзялення Белнацкама ля будынка Публічнай бібліятэкі падчас адбыцця ў Мінск. Петраград, не раней 26 студзеня 1919 г.

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# РАЗМЕРКАВАННЕ Ў ПЫТАННЯХ І АДКАЗАХ

**У першыя вясеннія месяцы на ўсіх факультэтах распачынаюць працу камісіі па персанальным размеркаванні і працаўладкаванні выпускнікоў. Ужо 1 сакавіка пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ правяла штогадовы семінар для студэнтаў Белдзяржуніверсітэта. Ён выклікаў вялікую цікавасць сярод навучэнцаў старэйшых курсаў, якія атрымалі магчымасць задаць найбольш хвалюючыя пытанні намесніку старшыні Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раману Дапіру і загадчыцы аддзела прававой абароны, галоўнаму інспектару працы названай арганізацыі Ларысе Манюк. Прапануем вашай увазе некаторыя істотныя аспекты гэтай сустрэчы.**

**– Якім чынам маладому спецыялісту звольніцца з месца па размеркаванні, калі ў жыцці адбыліся змены: вяселле, нараджэнне дзіцяці, пераезд у іншы горад, дзе ўжо знойдзена новая праца?**

– Раней у такой сітуацыі вы атрымлівалі згоду сённяшняга і будучага начальнікаў, прыходзілі ў alma mater – і вас "перараэмяркоўвалі", але ў верасні мінулага года былі ўнесены значныя праўкі ў "Палажэнне аб размеркаванні...". Галоўная навацыя, супраць якой актыўна выступаюць прафсаюзы, – пазбаўленне маладых спецыялістаў права звольніцца ў сувязі са змяненнем абставін, нягледзячы на згоду абодвух бакоў. Зараз мусіце два гады працаваць там, куды вас накіравалі, нават калі начальнік не выконвае ўмовы калектыўнага дагавора. Звольніцца і не вяртаць дзяржаве сродкі за вучобу можна толькі тады, калі ліквідуецца арганізацыя-наймальнік.



*Раман Дапіра ўзнагароджвае студэнтку факультэта журналістыкі Надзею Дрыпа сертыфікатам стыпендыята*

**– Ці могуць узнікнуць перашкоды пры паступленні ў магістратуру і аспірантуру?**

– Навучанне ў магістратуры разглядаецца як атрыманне адукацыі больш высокай ступені. Таму вы вызваляецеся ад вяртання сродкаў за вучобу пры адпаведным паступленні. Аднак аспірантура – гэта не вышэйшая ступень адукацыі, а сістэма падрыхтоўкі кадраў навуковай кваліфікацыі, таму тут магчымыя пытанні. Але скаргаў на тое, што камусьці не далі паступіць у аспірантуру, у нас пакуль не было – вучыцеся на здароўе.

**– Якім будзе тэрмін адпрацоўкі, калі перавесціся на платную форму навучання за семестр – два да заканчэння ВНУ?**

– Пакуль што "Палажэнне аб размеркаванні..." разглядае такіх студэнтаў як "платнікаў" і дае ім права на самастойны пошук працы, не прымушаючы адпрацоўваць час навучання на бюджэтнай форме. Калі ж вы вучыліся за грошы і ў апошні год/семестр перавяліся на бюджэтнае навучанне, то мусіце працаваць абавязкова два гады. Але ж сітуацыя масавага пераводу на апошніх курсах можа выклікаць у адпаведных дзяржаўных органаў жаданне ўнесці змены ў дзеючае заканадаўства, паводле якіх такія выпускнікі будуць абавязаны адпрацаваць прапарцыянальна тэрміну навучання за кошт бюджэтных сродкаў. Аналагічная сітуацыя з паступленнем у платную магістратуру. Хутчэй за ўсё, адразу пасля яе заканчэння прыйдзецца вярнуцца на месца па размеркаванні і дапрацаваць астатні тэрмін.

**– Прыйшоў на працу па размеркаванні, але там сказалі – сітуацыя змянілася і вакансій няма...**

– Такія акалічнасці зараз сустракаюцца даволі часта. "Палажэнне аб размеркаванні..." дазваляе наймальніку адмаўляць маладому спецыялісту ў прыняцці на працу – на нашую думку, гэта сапраўдная дыскрэдытацыя. Прычыны для адмовы заўсёды знойдуцца: прадпрымальнік, напрыклад, збіраўся пашырыць вытворчасць, але павялічыліся падаткі – і ён перадумаў. Вы павінны ў такім выпадку ўзяць у наймальніка пісьмовае тлумачэнне адмовы, прыехаць з гэтай паперай у ВНУ – і там вам прапануюць тыя вакансіі, што засталіся, а калі іх няма – атрымаеце права самастойнага ўладкавання. Такім чынам, студэнт-выдатнік, якога дзяржава паспяхова рыхтавала пяць гадоў і які меў права на найлепшае прапоўнае месца, можа ў рэшце рэшт застацца ні з чым і пайсці працаваць не па спецыяльнасці. Мы, зразумела, будзем выступаць супраць – калі наймальнік заявіў аб наяўнасці вакансій, пасля ён абавязаны забяспечыць вас працай.

**– Як уплывае на размеркаванне наяўнасць запыту з той ці іншай установы?**

– Запыт – гэта пісьмовая форма пацвярджэння, што наймальнік жадае ўладкаваць вас да сябе на працу са статусам маладога спецыяліста і здзейсніць усе належныя выплаты (30 дзён пасьлядыпломнага адпачынку ўсім маладым спецыялістам і 45 дзён педагогам аплачваюцца ў памеры стыпендыі, якая была прызначана да заканчэння ВНУ). Але асабліва не разлічвайце на запыт з сістэмы адукацыі, бо ўсе заяўкі такога кшталту фарміруюцца ў верасні папярэдняга года. На некаторыя адпаведныя спецыяльнасці Мінску былі патрэбныя толькі 1–2 чалавекі – і гэта пры тым, што некалькі ВНУ краіны штогод рыхтуюць сотні такіх спецыялістаў. Перад камісіяй па размеркаванні стаіць задача працаўладкаваць па магчымасці ўсіх выпускнікоў, якія навучаліся за бюджэтныя сродкі, і выканаць план, даведзены Міністэрствам адукацыі. Калі колькасць выпускнікоў перавышае колькасць заявак па плане размеркавання, тады вырашэнне пытання па індывідуальным запыце (у тым ліку з недзяржаўных арганізацый) будзе, хутчэй, станоўчым. На месцах, як правіла, гэта пытанне вырашаецца на карысць выпускніка.

### Лічбы

Каля 160-ці тысяч членаў прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі – студэнты. Амаль для пятай часткі з іх пытанні размеркавання надзвычай актуальныя.



52 % навучэнцаў дзяржаўных ВНУ – "платнікі". Яны не падпадаюць пад агульнае размеркаванне.

Калі ВНУ ўладкоўвае на працу меней за 90 % выпускнікоў бюджэтнай формы навучання, то ў наступным годзе колькасць бюджэтных месцаў па "неўладкаванай" спецыяльнасці скарачаецца і асобныя выкладчыкі могуць застацца без работы.

### Заканадаўства

У 2002 годзе было прынята "Палажэнне аб размеркаванні выпускнікоў устаноў адукацыі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную або вышэйшую адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў". Пасля з'явіліся і іншыя нарматыўна-прававыя акты, якія рэгулююць адносіны ў дадзенай сферы. Знайсці гэтыя дакументы з адпаведнымі каментарыямі, а таксама блок кансультацый па тэме можна ў зборніку "Размеркаванне і працаўладкаванне", які быў падрыхтаваны спецыяльна да семінара.

### Усе ў чэргі!

"Палажэнне аб размеркаванні..." заначае, што пры размеркаванні ўлічваюцца поспехі ў вучобе. На практыцы гэта выглядае так: студэнты, якія добра вучыліся, маюць пераважнае права выбіраць месца працы з наяўных па сваім гусце. А менш паспяховыя выбіраюць з таго, што засталося. Дадатковыя чэргі ўтвараюць студэнты-"ільготнікі" (сямейныя студэнты з дзецьмі; студэнты з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця; студэнты, бацькі якіх па стане здароўя патрабуюць пастаяннага дагляду і да т.п.) і студэнты-"актывісты" (старасты груп, удзельнікі саветаў па якасці адукацыі і г.д.).

Ва ўмовах абмежаванасці месцаў і вялікай колькасці выпускнікоў вам ад арганізацыі можа паступіць прапанова заняць не вакансію, а месца чалавека, які часова не працуе, напрыклад, знаходзіцца ў адпачынку па цяжарнасці і родах, па дагляду дзіцяці. Вы можаце пагадзіцца, калі будзе канкрэтная дамоўленасць з наймальнікам наконт далейшага пераводу. Але мы не раім гэтага рабіць, бо так кіраўнік не нясе за яе выкананне ніякай прававой адказнасці.

### Не лянуйцеся пісаць:

*заяву на імя дэкана з сваімі пажаданнямі па працаўладкаванні – спатрэбіцца пры папярэднім размеркаванні;

*заяву на імя дэкана з тлумачэннем абставін, што ўзніклі ў вашым жыцці пасля папярэдняга размеркавання;

*тлумачальную запіску, калі яе ад вас патрабуе наймальнік, – гэта адзіны сродак паказаць сітуацыю з вашага пункта гледжання, і такая папера можа быць выкарыстана ў судзе на вашую карысць.

Па пытаннях размеркавання, працаўладкавання і абароны правоў маладых спецыялістаў вы можаце звярнуцца да Беларускага прафсаюза працаўнікоў адукацыі і навукі:

- Раман Восіпавіч Дапіра (тэл. 203-81-39);

- Ларыса Васільеўна Манюк (тэл. 203-81-18).

Запіс на індывідуальныя кансультацыі праводзіцца па тэл. 206-22-33, 209-57-05.

**Падрыхтавала**
**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА**

ПАДЗЕІ

# НА ЛЕКЦЫІ ДА АКАДЭМІКА ЛУКАШОВА!

***Міжнародная навуковая канферэнцыя "Сучасныя праблемы геахіміі, геалогіі і пошукаў радовішчаў карысных выкапняў", прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння выдатнага беларускага геолага і географа, акадэміка Канстанціна Лукашова, прайшла з 14 па 16 сакавіка на геаграфічным факультэце БДУ.***

Яна сабрала каля 200 навукоўцаў, спецыялістаў і экспертаў у вобласці геаграфіі, геалогіі, экалагічнай геахіміі і мінералогіі, якія прадстаўляюць розныя універсітэты, галіновыя інстытуты і ўстановы Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы і Германіі. Канферэнцыя распачалася выступленнямі рэктара БДУ прафесара Васіля Стражава, дэкана геаграфічнага факультэта прафесара Івана Пірожніка і ўнука славутага вучонага – дацэнта Алега Лукашова. Асобным мерапрыемствам стала адкрыццё мемарыяльнага кабінета акадэміка К.І. Лукашова.

Работа канферэнцыі працягнулася ў секцыях "Экалагічная геалогія і экалагічная геахімія"; "Геалогія і карысныя выкапні"; "Геахімія і мінералогія", а таксама ў секцыі, прысвечанай дакладам маладых навукоўцаў. Акрамя геаграфічнага факультэта, круглыя сталы прайшлі таксама ў Інстытуце геахіміі і геафізікі НАН Беларусі. У апошні дзень праграмы ўдзельнікі канферэнцыі пазнаёміліся з геолага-геамарфалагічнымі асаблівасцямі Мінскага ўзвышша падчас палявой экскурсіі па маршруце Мінск – Раўбічы – Лагойск.

**Валянціна КЛЯНІЦКАЯ**
**Фота Аляксандра СНАПКА**



*На адкрыцці мемарыяльнага кабінета імя акадэміка К.І. Лукашова*

Канстанцін Ігнацьевіч Лукашоў – доктар геолага-мінералагічных навук (1937), акадэмік АН БССР (1953), заслужаны дзеяч БССР (1967), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1972), атрыманай за адкрыццё і разведку буйных нафтавых радовішчаў Прыпяцкай нафтагазаноснай вобласці. Акадэмік К.І. Лукашоў з 1952 г. па 1957 г. з'яўляўся рэктарам БДУ. З 1956 г. па 1969 г. – віцэ-прэзідэнт АН БССР. У 1971–77-х гг. – дырэктар Інстытута геахіміі, чацвярцічнай геалогіі і геахіміі, рацыянальнага выкарыстання і аховы навакольнага асяроддзя.

Вынікі навуковай дзейнасці славутага вучонага адлюстраваны больш чым у 500-х навуковых працах, у тым ліку 55-ці манаграфіях і падручніках. За сваю плённую працу Канстанцін Лукашоў быў узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1945, 1966), ордэнам Дружбы народаў (1977) і некалькімі медалямі.

КОНКУРСЫ

# ЗАДАЧА – НАМАЛЯВАЦЬ ПЛАКАТ

З 12 лютага па 1 сакавіка ў галоўным корпусе БДУ праводзіўся агляд-конкурс студэнскіх плакатаў і насценных газет па прапагандзе здаровага ладу жыцця. Ладзіўся ён упраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю (УВРМ) з мэтай фарміравання ў юнакоў і дзяўчат адказнасці за ўласнае здароўе, а таксама прафілактыкі наркаманіі, алкагалізму і тытунекурэння. Усяго ў конкурсе прынялі ўдзел 60 чалавек, якія афармілі больш за 80 творчых работ.

Паводле вынікаў, падведзеных экспертнай камісіяй, першае месца занялі студэнткі Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій Іна Макарчук і Наталля Яскевіч. Другое месца дасталася Аляксандру Жуку з гістарычнага факультэта. Трэцяе месца занялі Анастасія Масарноўская і Таццяна Котава таксама з гістарычнага факультэта. Усе пераможцы атрымалі грашовыя прэміі: 500, 300 і 200 тысяч рублёў ў адпаведнасці з ранжырам.

**Паводле інфармацыі УВРМ**

## БДУ ў СМІ Беларусі

**"Кірмаш вакансій" на геаграфічным факультэце БДУ** – "Звязда" (28.02); "Минский курьер"; "Рэспубліка" (01.03).

**28-ы Міжнародны матэматычны турнір гарадоў, адным з галоўных арганізатараў якога выступіў ФПМІ БДУ** – "Минский курьер" (01.03); "Настаўніцкая газета" (13.03).

**Каментар дырэктара абсерваторыі БДУ Альгерда Кузнечыка наконт зацьмення Месяца** – "Народная газета" (01.03); "Экспресс-новости" (01.03); "Беларусь сегодня" (01.03); "Минский курьер" (02.03).

**XIV чэмпіянат РБ па інтэлектуальных гульнях сярод дзяцей школьнага ўзросту на базе ФПМІ** – "Звязда" (02.03).

**Навучанне расійскіх студэнтаў у БДУ** – "Российская газета" (01.03).

**Конкурс "Супермэн БДУ"** – "Вечерний Минск" (05.03); "Звязда" (10.03).

**Мерапрыемствы на геаграфічным факультэце БДУ, прымеркаваныя да 100-годдзя акадэміка, былога рэктара БДУ Канстанціна Лукашова** – "Рэспубліка" (14.03).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ шырока паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы, тэлеканалы, Беларускае радыё і FM-станцыі.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## АБ'ЯВЫ

**РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА**
**аб'яўляе конкурс**
**на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: кібернетыкі, матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных сістэм кіравання, грамадзянскага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, тэлебачання і радыёвяшчання, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычных метадаў тэорыі кіравання, матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных сістэм кіравання, сацыяльнай камунікацыі, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: біяфізікі, ядзернай фізікі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, фізікі цвёрдага цела, фізічнай оптыкі, квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі, фізікі, фізічнай электронікі, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, функцыянальнага аналізу, лікавых метадаў і праграміравання, вышэйшай матэматыкі, вылічальнай матэматыкі, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў, тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі, тэхналогіі праграміравання, матэматычнай фізікі, заалогіі, мікрабіялогіі, арганічнай хіміі, неарганічнай хіміі, фізічнай хіміі, замежнай літаратуры, рускай літаратуры, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, экалагічнага і аграрнага права, сацыялогіі, псіхалогіі, сацыялогіі журналістыкі, перыядычнага друку, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:сістэмнага аналізу, кібернетыкі, фізікі, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, дыферэнцыяльных ураўненняў, фізіялогіі і біяхіміі раслін, геаграфічнай экалогіі, глебазнаўства і геалогіі, эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, англійскага мовазнаўства, сучаснай беларускай мовы, гісторыі беларускай мовы, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, сацыяльнай камунікацыі, псіхалогіі, філасофіі культуры, сацыялогіі журналістыкі, нямецкай мовы;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнага землязнаўства, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, псіхалогіі, філасофіі і метадалогіі навукі, сацыяльнай камунікацыі, псіхалогіі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, нямецкай мовы;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: ядзернай фізікі, фізікі цвёрдага цела, радыёфізікі, інфарматыкі, вышэйшай матэматыкі, метадаў аптымальнага кіравання, заалогіі, мікрабіялогіі, неарганічнай хіміі.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц са дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул.Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ЦЭНТР МАНІТОРЫНГУ АЗОНАСФЕРЫ**
**аб'яўляе конкурс**
**на замяшчэнне вакантнай пасады**

*малодшага навуковага супрацоўніка* па спецыяльнасці "Урач-фізіёлаг".

**Адрас: 220264 г. Мінск, вул. Курчатава, 7-910, тэл/факс 278-17-95, тэл. 278-47-00.**

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**
**аб'яўляе конкурс**
**на замяшчэнне пасад**
*дацэнтаў кафедраў:*

- эканамічнага права (1);
- эканомікі і кіравання бізнесам (2).

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц са дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.**

**"ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ" БДУ**
**аб'яўляе конкурс**
**на замяшчэнне вакантных пасад:**

- *галоўнага навуковага супрацоўніка* па спецыяльнасці "Фізіка кандэнсаванага стану " (1);
- *навуковага супрацоўніка* па спецыяльнасці "Радыёфізіка" (1);
- *малодшага навуковага супрацоўніка* па спецыяльнасці "Тэхналогія і перапрацоўка палімераў і кампазітаў" (1).

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц са дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220264 г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 212-48-43.**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# САМЫЯ КАМПЕТЭНТНЫЯ ПА ПРАВЕ!

На юрыдычным факультэце 2–3 сакавіка прайшла Рэспубліканская алімпіяда па правазнаўстве, якая сабрала найлепшых прадстаўнікоў студэнцтва з найбольш значных вышэйшых навучальных устаноў краіны. Упершыню яна праходзіла пад патранажам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і ладзілася на базе юрыдычнага факультэта. Адкрываў фінальныя туры намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Казімір Фарына.

Галоўнай мэтай алімпіяды было стымуляванне і падтрымка навукова-даследчай дзейнасці сярод студэнтаў юрыдычных факультэтаў, удасканаленне сістэмы беларускай юрыдычнай адукацыі, а таксама арганізацыя кантролю за ўзроўнем выкладання юрыдычных дысцыплін у розных універсітэтах.

Спаборніцтвы праходзілі ў камандным і індывідуальным заліках, кожны з якіх складаўся з завочнага тура, вочнага адборачнага тура і фіналу. Адна ВНУ магла выставіць не больш за дзве каманды.

Па выніках каманднага тура адразу два калектывы юрыдычнага факультэта БДУ перамаглі на гэтай алімпіядзе: каманда "JUST CAUSE" заняла першае месца, а каманда "Юрысты XXI ст." – другое. Вынікі індывідуальнага тура таксама сталі паспяховымі для нашых прадстаўнікоў: студэнтка Ірына Галубенка заняла другое месца, а студэнт Дзмітрый Аўдзееў – трэцяе.

Такім чынам Беларускі дзяржаўны універсітэт пацвердзіў сваю вядучую ролю ў галіне падрыхтоўкі юрыдычных кадраў у краіне.

**Алена МІХНО**

# НА ГЕАФАКЕ РАЗБІРАЛІ "ГАРАЧЫЯ ПІРАЖКІ"

***На геаграфічным факультэце 1 сакавіка ўпершыню быў праведзены "Кірмаш вакансій".***

На гэтым вучэбным падраздзяленні вядзецца шматпрофільная падрыхтоўка кадраў па 3-х спецыяльнасцях і 16-ці спецыялізацыях, але профільных прадпрыемстваў і ўстаноў, куды б маглі ўладкавацца выпускнікі-географы, няшмат. Таму кіраўніцтва факультэта разам з кафедрамі паклапацілася адшукаць альтэрнатыўныя варыянты за кошт няпрофільных устаноў. У выніку мэтанакіраванай дзейнасці ўдалося зацікавіць ажно 14 сур'ёзных структур, сярод якіх традыцыйныя партнёры: Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, дэпартаменты па геалогіі, гідраметэралогіі, падведамасныя навуковыя, вытворчыя і вучэбныя прадпрыемствы і арганізацыі (Белгеадэзія, Белкартаграфія, Белдзіпразем), а таксама навукова-даследчыя і праектныя інстытуты, падраздзяленні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь і яго тэрытарыяльныя органы. Урэшце, на прапанову прыняць удзел у кірмашы адгукнулася шмат кіраўнікоў прадпрыемстваў, з якімі геаграфічны факультэт раней не падтрымліваў сувязяў. Гэта, напрыклад, «Цэнтркурорт», Інстытут інфарматыкі НАН Беларусі, турагенцтва «Гарачыя пуцёўкі» і інш. Усе работадаўцы атрымалі магчымасць пазнаёміцца з вучэбнымі праграмамі кафедраў і запрасіць да сябе студэнтаў II–III курса на практыку, бо ў гэткім выпадку магчыма эфектыўная падрыхтоўка неабходных спецыялістаў.

Але галоўнае дасягненне гэтага мерапрыемства – значная колькасць заявак ад наймальнікаў на сённяшніх выпускнікоў факультэта. Як пажартаваў у бок сваіх выхаванцаў вельмі задаволены дэкан факультэта Іван Пірожнік, "«піражкі» з геафака размяталіся як гарачыя булачкі".

**Лілія ХАРЫТОНАВА,**
**метадыст геаграфічнага факультэта**

## КАНЦЭРТЫ

# ТАЛЕНТ ВУЧОБЕ НЕ ПЕРАШКАДЖАЕ



***Што рабіць і куды ісці, калі тваё творчыя задумкі не могуць змясціцца ў галаве? Адказ просты – трэба дарыць іх іншым! Менавіта гэта і здзяйсняюць студэнты самага прэстыжнага універсітэта нашай краіны.***

14 сакавіка адбыўся фінальны гала-канцэрт Фестывалю эстрады БДУ. Усяго прынялі ўдзел каля 280 студэнтаў з усіх факультэтаў БДУ. 58 самых творчых асоб з 30-цю арыгінальнымі нумарамі дайшлі да фіналу, адолеўшы тры адборачных туры. У кампетэнтнае і строгае журы ўвайшлі Леанід Шырын – прадзюсер Карыянны, спявачка Вольга Вронская і інш.

На конкурсе былі прадстаўлены такія жанры, як эстрадная, аўтарская і класічная песня, народны і эстрадны танец, майстэрства выканання і гутарковы жанр. Журы сапраўды не чакала, што ім прыйдзецца ацэньваць столькі адораных студэнтаў. А гледачы-аднакурснікі даведаліся пра новыя таленты сваіх сяброў.

Пераможцамі ў адной з галоўных намінацый – "Эстрадная і класічная песня" – сталі студэнты з Кітая Чжан Сяоцянь і Вэй Вэй (ФДА); з найлепшай аўтарскай песняй "Вечны агонь" выступіў Дзмітрый Кузюбердзін (РФіЭ). Намінацыю "Народны танец" выйграла студэнтка гуманітарнага факультэта Алена Ляшчынская.

Пакуль журы займалася падлікам балаў, на сцэне ліцэя БДУ выступіў Георгій Калдун – спявак, радыё-дзіджэй і, магчыма, прадстаўнік Беларусі на міжнародным фестывалі "Славянскі базар у Віцебску".

Канкурсанты, журы і, галоўнае, гледачы засталіся задаволенымі гала-канцэртам, бо атрымалі шмат станоўчых эмоцый і цудоўны настрой.

**Яўген ПЕРЛІН**

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

# У БДУ З'ЯВІЎСЯ "СУПЕРМЭН"!

***У актавай зале ліцэя БДУ 28 лютага адбылося феерычнае шоу "Супермэн–2007", арганізаванае Студгарадком.***



Дзевяць найбольш прыкметных хлопцаў змагаліся за званні "Супермэн года", "Містэр года" і прыз "Сімпатыі гледачоў". Кожны з іх прадстаўляў свой інтэрнат і быў пераможцам адборачных тураў, якія праходзіліся ў снежні–студзені. Юнакам неабходна было прэзентаваць свой вобраз, паказаць акцёрскія здольнасці і праявіць сябе ў інтэлектуальным конкурсе.

На гэты раз удзельнікі мерапрыемства ўразілі ўсіх сваімі "візітоўкамі". Гарачыя танцы змяняліся душэўнымі песнямі, сардэчнымі прызнаннямі ў каханні, раздачай кветак глядачкам і іншымі адмысловымі момантамі, якія паўплывалі на вызначэнне пераможцаў.

Самымі запамінальнымі музычнымі нумарамі сталі "Грэчаскае вяселле" ў выкананні Тараса Моха (інтэрнат № 1), шумны і вясёлы "Клуб" пад кіраўніцтвам Мікалая Банасевіча (інт. № 2), а таксама нечаканае і сардэчнае прызнанне Станіслава Савіцкага (інт. № 5).

Паводле вынікаў конкурсу чынным тытулам "Супермэн–2007" быў ганараваны студэнт I курса ФПМІ Максім Квяткоўскі (інт. № 6). У падарунак ён атрымаў тэлевізар. Званне "Містэр–2007" за другое месца, а таксама прыз у намінацыі "Сімпатыі гледачоў" дасталіся першакурсніку факультэта журналістыкі Ігару Туру. Яму ў якасці ўзнагароды выпала рамантычная вячэра на дваіх у рэстаране.

Увесь вечар на сцэне панаваў святочны настрой, які падарылі ўсім прысутным удзельнікі конкурсу. "Супермэн–2007" закончыўся, цяпер у дзяўчат БДУ з'явіўся новы герой.

**Кацярына БУЛАЦЕЦКАЯ**

## АКЦЫІ

# ВЕРШЫ – НА ЗДАРОЎЕ!

***Акцыя "Здароўе жанчыны – здароўе нацыі" прайшла 5 сакавіка ў актавай зале галоўнага корпуса Беларускага дзяржаўнага універсітэта.***

Праграма мерапрыемства ўключала прэзентацыю лекавых раслін і айчынных лекавых прэпаратаў. Акрамя таго, усе жадаючыя маглі атрымаць кансультацыю ў вядучых урачоў-спецыялістаў: галоўнага мамолага Беларусі, доктара медыцынскіх навук прафесара Леаніда Путырскага; эндакрынолага, доктара медыцынскіх навук Таццяны Мохарт; гастраэнтэролага, доктара медыцынскіх навук прафесара Івана Бранаўца, а таксама дыетолага, кандыдата медыцынскіх навук Ніны Барушко.

Адзін з тых, хто прыйшоў на гэтую акцыю не ўпершыню, – Леанід Путырскі, які на гэты раз не толькі падзяліўся з жанчынамі БДУ спецыяльнымі ведамі, але і падарыў кожнай з прысутных зборнік уласных твораў са шматлікімі паэтычнымі кампліментамі ў адрас дам. Сярод навічкоў сёлетняга мерапрыемства апынуўся кіраўнік лабараторыі фармакалогіі і таксікалогіі РУП "Белмедпрэпараты" Сяргей Шляхцін. Ён расказаў пра апошнія арыгінальныя лекавыя сродкі, якія выпускае старэйшы ў Беларусі завод медыцынскіх прэпаратаў. З альтэрнатыўнымі прапановамі выступіў прадстаўнік фірмы "ФитоГоР" Уладзімір Рымша.

Таксама ў рамках акцыі прайшла выстава-кірмаш насення для дома і агарода, якое прадставіў БелНДІ агародніцтва.

Напрыканцы ўсе ўдзельніцы атрымалі ў падарунак вітамінна-мінеральныя комплексы.

Такая сустрэча праводзілася саюзам жанчын БДУ ўжо ў восьмы раз з мэтаю прапаганды здаровага ладу жыцця і інфармавання супрацоўніц БДУ па найбольш праблемных пытаннях.

**Ганна ШЫЛЕЦ**

## З УСМЕШКАЙ

Абітурыентка прыходзіць на ўступныя экзамены ў прэстыжную ВНУ. Старшыня прыёмнай камісіі пытаецца ў яе:

– Спадарычна, з якіх меркаванняў вы выбралі нашу ВНУ?

– Тата, хопіць жартаваць!

***

– Паслухайце, – не вытрымлівае выкладчык, – я вам ужо трэці раз стаўлю тройку. Чаму вы не вучыцеся? Урэшце, ад вучобы яшчэ ніхто не паміраў!

– Я ведаю, – кажа студэнт, – але лепей не рызыкаваць.

***

Студэнт прызначыў дзяўчыне спатканне. Гуляючы па горадзе, яны праходзяць паблізу шыкоўнага рэстарана.

– Як смачна пахне! – усклікае дзяўчына.

– Табе падабаецца? Хочаш мы там яшчэ раз пройдземся? – пытаецца хлапец.

***

Сядзяць два студэнты-фізікі ў сталоўцы і бурна абмяркоўваюць нейкую задачу. Паблізу праходзіць даволі эфектная дзяўчына. Яны адначасова змаўкаюць і праводзяць яе позіркам... Пасля паўзы адзін з іх кажа:

– Гэта ж трэба, як цікава згрупаваліся атамы...

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

20 сакавіка 2007 года.
Падпісана да друку 17.03.2007 г.
Зак. 176. Тыраж 1500 экз.Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6.

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by